# Змест

РУНА ПЕРШАЯ .......... 5

*Уступ (1–102). Дзева паветра апускаецца на марскія хвалі і, зацяжараўшы ад ветру і вады, становіцца маці вады (103–176). Качка звівае гняздо на калене маці вады і адкладае яйкі (177–212). Яйкі выпадаюць з гнязда і разбіваюцца на кавалкі, што ператвараюцца ў неба, зямлю, сонца, месяц ды хмары (213–244). Маці вады стварае мысы, затокі, берагі, водмелі ды глыбіні мора (245–280). Маці вады нараджае Вяйнямёйнена; яго доўгі час носіць па хвалях, аж пакуль прыбоем не прыганяе да берага (281–344).*

РУНА ДРУГАЯ .......... 14

*Вяйнямёйнен выходзіць на сушу, дзе няма ніводнага дрэўца і пасылае малога Сампсу Пелервойнена засеяць зямлю дрэвамі (1–42). Дрэвы вырастаюць, не прарастае толькі дуб, але, зноўку пасеяны, ён разрастаецца так, што сваімі шатамі захінае сонца і месяц (43–110). Маленькі чалавек выходзіць з мора і ссякае дуб; сонца і месяц ізноў бачныя (111–224). На дрэвах пяюць птушкі, на зямлі вырастаюць травы, кветкі ды ягады, не расце толькі ячмень (225–236). Вяйнямёйнен знаходзіць на беразе некалькі зярнят ячменю, высякае лес і пакідае толькі адну бярэзіну для птушак (237–264). У падзяку за гэта арол высякае для Вяйнямёйнена агонь, каб той мог выпаліць ляда (265–286). Вяйнямёйнен засявае ячмень і ўзносіць модлы, каб ячмень даў добрыя парасткі, а зямля заўсёды была ўрадлівая (287–378).*

РУНА ТРЭЦЯЯ .......... 24

*Вяйнямёйнен запасіць веды і робіцца славутым (1–20). Ёўкахайнен едзе спаборнічаць з ім у ведах, але не перамагае і выклікае яго на двубой на мячах. Раззлаваны Вяйнямёйнен чароўнымі спевамі заганяе яго ў балота (21–330). Спалоханы Ёўкахайнен прапануе яму пабрацца са сваёй сястрою, і задаволены Вяйнямёйнен выпускае яго з балота (331–476). Засмучаны Ёўкахайнен едзе дадому і расказвае маці пра свае прыгоды (477–524). Маці ў захапленні ад таго, што Вяйнямёйнен стане яе зяцем. Аднак гэтая навіна вельмі засмучае дачку, і яна пачынае плакаць (525–580).*

РУНА ЧАЦВЁРТАЯ .......... 38

*Вяйнямёйнен сустракае ў лесе сястру Ёўкахайнена і прапануе ёй стаць ягонай жонкай (1–30). Дзяўчына ў слязах бяжыць дахаты і расказвае ўсё сваёй маці (31–116). Маці ўгаворвае дачку не засмучацца, а радавацца і насіць прыгожыя строі (117–188). Дзяўчына ўсё плача і кажа, што не хоча ісці за старога (189–*

*254). Засмучаная, яна ідзе ў лес, трапляе на незнаёмы бераг мора, хоча пакупацца і патанае (255–370). Маці дзень і ноч плача і бядуе па сваёй дачцэ (371–518).*

РУНА ПЯТАЯ ....................................................................................................51

*Вяйнямёйнен ідзе да мора, каб перахапіць сястру Ёўкахайнена. Яна трапляецца яму на вуду ў выглядзе рыбіны (1–58). Вяйнямёйнен хоча парэзаць рыбіну на кавалкі, але тая выслізгвае з рук і прызнаецца, хто яна напраўду такая (59–133). Дарэмна Вяйнямёйнен спрабуе ўгаварыць яе вярнуцца ды злавіць у нерат (134–163). З цяжкімі думкамі ён вяртаецца дадому і атрымлівае ад сваёй маткі параду ехаць сватацца да дачкі Пох'ялы (164–241).*

РУНА ШОСТАЯ...................................................................................................57

*Ёўкахайнен злуецца на Вяйнямёйнена і падпільноўвае яго па дарозе ў Пох'ялу (1–78). Ён бачыць, як Вяйнямёйнен пераязджае на кані праз рэчку, і страляе з лука, але страла трапляе ў каня (79–182). Вяйнямёйнен падае ў ваду, моцны вецер выносіць яго ў адкрытае мора, і Ёўкахайнен радуецца, думаючы, што стары песняспеўца болей ніколі не спяе новых песень (183–234).*

РУНА СЁМАЯ .....................................................................................................63

*Шмат дзён плаваў у моры Вяйнямёйнен, аж пакуль яго не ўбачыў арол. У падзяку за тое, што Вяйнямёйнен пакінуў сярод ляда дрэва для адпачынку птушкам, арол пасадзіў яго сабе на спіну і занёс у Пох'ялу, дзе гаспадыня Пох'ялы старая Лоўхі прыводзіць яго ў свой дом і прымае госця вельмі добразычліва (1–274). Але Вяйнямёйнен сумуе па родных мясцінах. Лоўхі абяцае не толькі адпусціць яго дадому, але і аддаць за яго сваю дачку, калі той выкуе Сампа для Пох'ялы (275–322). Вяйнямёйнен абяцае прыслаць у Пох'ялу каваля Ілмарынена, каб той выкаваў Сампа. Гаспадыня Пох'ялы дае Вяйнямёйнену каня і сані, каб ён мог паехаць дадому (323–368).*

РУНА ВОСЬМАЯ ................................................................................................73

*Па дарозе дадому Вяйнямёйнен сустракае дзяўчыну з Пох'ялы ў прыгожых строях і просіць яе выйсці за яго замуж (1–50). Дзяўчына дае згоду, але пры ўмове, што Вяйнямёйнен змайструе човен з кавалкаў верацяна і спусціць яго на ваду, не датыкаючыся (51–132). Вяйнямёйнен пачынае рабіць човен сякерай, але рассякае сабе калена і ніяк не можа спыніць кроў (133–204). Тады ён ідзе на пошукі чалавека, які змог бы загаварыць кроў, і знаходзіць старога, які абяцае зрабіць гэта (205–282).*

РУНА ДЗЯВЯТАЯ ...............................................................................................81

*Вяйнямёйнен расказвае старому, адкуль узялося жалеза (1–266). Стары праклінае жалеза, і кроў перастае цячы (267–418). Стары пасылае сына зрабіць гаючае зелле, змазвае і перавязвае рану. Вяйнямёйнен вылечваецца і ўзносіць хвалу Богу (419–586).*

РУНА ДЗЯСЯТАЯ ....................................................................................97

*Вяйнямёйнен вяртаецца дадому і прапануе Ілмарынену ехаць у Пох'ялу сватаць дзяўчыну, якую ён возьме замуж, калі скуе Сампа (1–100). Ілмарынен не хоча ехаць у Пох'ялу, але Вяйнямёйнен сваімі чарамі прымушае Ілмарынена паехаць туды (101–200). Ілмарынен прыязджае ў Пох'ялу, яго там гасцінна сустракаюць і прапануюць выкаваць Сампа (201–280). Ілмарынен выкоўвае Сампа, і гаспадыня Пох'ялы, старая Лоўхі, хавае Сампа ў каменнай гары Пох'ялы (281–432). Ілмарынен просіць аддаць за яго дзяўчыну як узнагароду за працу, але дзеўка выдумляе ўсялякія прычыны, з якіх яна не можа пакінуць родны дом (433–462). Ілмарынену даюць човен, ён вяртаецца дадому і расказвае Вяйнямёйнену пра тое, што ён выкаваў Сампа ў Пох'яле (463–510).*

РУНА АДЗІНАЦЦАТАЯ .......................................................................... 111

*Лемінкяйнен едзе ў сваты да дзяўчыны Кюлікі са знатнага роду Сары (1–110). Спачатку дзяўчаты Сары смяюцца з яго, але потым знаёмяцца з Лемінкяйненам бліжэй (111–156). Толькі адна дзяўчына, Кюлікі, дзеля якой ён і прыехаў, не звяртае на яго ўвагі. Тады Лемінкяйнен выкрадае дзяўчыну, пад прымусам садзіць у сані і выпраўляецца ў дарогу (157–222). Кюлікі засмучаецца ад ваяўнічасці Лемінкяйнена, і яны даюць адно аднаму абяцанні: Лемінкяйнен ніколі не пойдзе на вайну, калі яна ніколі не будзе бегаць у вёску і балбатаць з суседкамі (223–314). Маці Лемінкяйнена ў захапленні ад маладой нявесткі (315–402).*

РУНА ДВАНАЦЦАТАЯ.......................................................................... 122

*Кюлікі забывае на сваю клятву і ідзе ў вёску. Лемінкяйнен у гневе вырашае тут жа кінуць яе і паехаць у сваты да дзяўчыны Пох'ялы (1–128). Маці адгаворвае яго ад паездкі, кажучы, што там яго чакае пагібель. Але Лемінкяйнен, які расчэсваў валасы, сярдзіта кідае грэбень і кажа, што калі яго параняць, дык з грабяня пацячэ кроў (129–212). Лемінкяйнен збіраецца ў дарогу і прыязджае ў Пох'ялу, дзе песнямі заклінае ўсіх мужчын, апрача аднаго злоснага пастуха (213–504).*

РУНА ТРЫНАЦЦАТАЯ .......................................................................... 136

*Лемінкяйнен просіць гаспадыню Пох'ялы аддаць за яго сваю дачку. Яна згаджаецца, але выстаўляе ўмову: Лемінкяйнен павінен злавіць у лесе лася Хійсі (1–30). Ён пачынае ўсяляк выхваляцца і едзе ў лес па здабычу. Але неўзабаве хвалько ўсведамляе, што адным пустаслоўем жывёлу не ўпалюеш (31–270).*

РУНА ЧАТЫРНАЦЦАТАЯ.......................................................................... 144

*Лемінкяйнен з дапамогай замоў і малітваў да сваіх багоў здабывае лася і прыводзіць яго ў Пох'ялу (1–270). Тады старая Лоўхі ставіць яму другую ўмову: злавіць і ўтаймаваць вогненнага каня Хійсі. Лемінкяйнен спраўляецца і з гэтым заданнем (271–372).*

*Апошняй умовай, якую выставіла яму Лоўхі, было заданне забіць лебедзя на рацэ Туані, якая аддзяляе падземнае царства памерлых ад царства жывых. Лемінкяйнен ідзе ў царства мёртвых Туанелу, але там, каля ракі, яго падпільноўвае стары пастух, якога Лемінкяйнен аблаяў у Пох'яле. Пастух спіхвае Лемінкяйнена ў вадаспад ракі мёртвых Туані. Сын смерці там рассякае цела Лемінкяйнена на кавалкі (373–460).*

РУНА ПЯТНАЦЦАТАЯ ........................................................ 157

*Дома з пакінутага Лемінкяйненам грабеньчыка пачынае ка́паць кроў; маці здагадваецца, што сын забіты. Яна ідзе ў Пох'ялу і пытаецца ў старой Лоўхі, куды яна падзела Лемінкяйнена (1–62). Лоўхі спачатку аднекваецца, але потым расказвае, якое заданне яна дала Лемінкяйнену. Сонца паказвае месца, дзе знаходзіцца забіты Лемінкяйнен (63–194). Маці Лемінкяйнена з доўгімі граблямі ідзе ў царства мёртвых Туанелу і выграбае з вадаспаду ўсе кавалкі сынавага цела, складае іх і з дапамогай заклёнаў ды зёлак вяртае сына да жыцця (195–554). Апрытомнеўшы, Лемінкяйнен расказвае маці пра свае прыгоды і вяртаецца з ёю дадому (555–650).*

РУНА ШАСНАЦЦАТАЯ ........................................................ 175

*Вяйнямёйнен хоча пабудаваць лодку і пасылае Сампсу Пелервойнена шукаць дрэваў на дошкі, потым замовамі робіць з дрэва човен, але яму не хапае трох словаў, каб скончыць працу (1–118). Вяйнямёйнен шукае словы, але нідзе не знаходзіць і ідзе ў Туанелу, адкуль яго не хочуць адпускаць назад (119–362). Дзякуючы моцы сваіх чараў Вяйнямёйнен вызваляецца, а вярнуўшыся назад, папярэджвае ўвесь свой народ, каб ніхто не хадзіў у Туанелу. Потым ён расказвае, як дрэнна жывуць там людзі, якія былі злымі ў жыцці (363–412).*

РУНА СЯМНАЦЦАТАЯ ........................................................ 186

*Вяйнямёйнен ідзе па словы да Антэры Віпунена і абуджае яго ад працяглага сну (1–98). Віпунен праглынае Вяйнямёйнена, а той пачынае да болю непакоіць яго, паставіўшы ў чэраве кузню (99–146). Віпунен чарадзейнымі замовамі імкнецца выгнаць Вяйнямёйнена, але беспаспяхова. Вяйнямёйнен пагражае не выйсці з чэрава Віпунена да тае пары, пакуль не даведаецца трох патрэбных яму словаў (147–526). Віпунен называе тры словы, і Вяйнямёйнен нарэшце вяртаецца дадому і дабудоўвае човен (527–628).*

РУНА ВАСЯМНАЦЦАТАЯ ........................................................ 203

*Вяйнямёйнен фарбуе човен і адплывае ў Пох'ялу сватацца да дачкі старой Лоўхі (1–40). Сястра Ілмарынена з берага распытвае яго, куды ён плыве, а потым бяжыць да брата, каб папярэдзіць таго, што ён можа спазніцца ў сваты (41–266). Ілмарынен збіраецца і едзе на кані ў Пох'ялу (267–470). Гаспадыня Пох'ялы ўпадабала*

*Вяйнямёйнена і раіць сваёй дачцэ выбраць яго (471–634). Але дачка адмаўляе Вяйнямёйнену і выбірае Ілмарынена, які зрабіў чароўнае Сампа (635–706).*

РУНА ДЗЕВЯТНАЦЦАТАЯ .......... 221

*Ілмарынен заходзіць у хату, сватаецца да дзяўчыны Пох'ялы, і маці нявесты даручае яму небяспечныя заданні (1–32). Дзяўчына Пох'ялы дае кавалю разумныя парады, і той паспяхова выконвае заданні. Ён узорвае змяінае поле, ловіць мядзведзя Туанелы ды ваўка Маналы і выцягвае вялізнага шчупака з рэчкі Туанелы. (33–344). Гаспадыня Пох'ялы робіць заручыны сваёй дачкі з Ілмарыненам (345–498). Засмучаны Вяйнямёйнен вяртаецца ў сваю краіну і не раіць старым супернічаць з маладымі (499–518).*

РУНА ДВАЦЦАТАЯ .......... 234

*У Пох'яле рыхтуюцца да вяселля і забіваюць вялікага быка (1–118). Вараць піва, разліваюць па бочках, гатуюць розную страву (119–516). Потым рассылаюць ганцоў запрашаць на вяселле гасцей, але Лемінкяйнен запрашэння не атрымлівае (517–614).*

РУНА ДВАЦЦАЦЬ ПЕРШАЯ .......... 250

*Сустрэча жаніха і ягоных сяброў у Пох'яле (1–226). Гасцей частуюць півам і смачнай ежай (227–252). Вяйнямёйнен пяе хваласпеў гаспадарам і дзякуе ім за гасціннасць і пачастунак (253–438).*

РУНА ДВАЦЦАЦЬ ДРУГАЯ .......... 262

*Маладую збіраюць у дарогу і пяюць аб мінулых днях і аб тым, што яе чакае наперадзе (1–124). Маладая засмучана хуткай разлукай і плача (125–448). Яе суцяшаюць (449–522).*

РУНА ДВАЦЦАЦЬ ТРЭЦЯЯ .......... 276

*Маладую павучаюць, як трэба паводзіць сябе ў доме свайго мужа (1–478). Старая жабрачка расказвае аб сваёй маладосці і аб тым, як няўдала яна была замужам і як сышла ад свайго мужа (479–850).*

РУНА ДВАЦЦАЦЬ ЧАЦВЁРТАЯ .......... 298

*Маладога навучаюць, як трэба абыходзіцца з жонкай (1–264). Стары жабрак расказвае, як яму ўдалося ўтаймаваць сваю жонку (265–296). Маладая бядуе, што ёй назаўсёды давядзецца пакінуць свой родны дом, і развітваецца з раднёй (297–462). Ілмарынен на руках выносіць маладую з хаты, садзіць у сані і ўвечары трэцяга дня прыязджае дадому (463–528).*

РУНА ДВАЦЦАЦЬ ПЯТАЯ .......... 312

*Ілмарынен з нявестай ды сябрамі прыязджае дадому (1–382). Усіх добра частуюць, і Вяйнямёйнен спявае хвалу жаніху, нявесце, гаспадарам і ўсім прысутным (383–672). Па дарозе з гасцей*

*у Вяйнямёйнена ламаюцца сані, ён іх напраўляе і шчасліва вяртаецца дахаты (673–738).*

РУНА ДВАЦЦАЦЬ ШОСТАЯ ........................................ 331
*Лемінкянен крыўдуе, што яго не запрасілі на вяселле, і вырашае паехаць у Пох'ялу без запросін. Маці адгаворвае яго і расказвае пра тое, якія смяротна небяспечныя перашкоды чакаюць яго па дарозе. Але Лемінкяйнен яе не слухае і збіраецца ў дарогу (1–322). Лемінкяйнен пярэчыць матцы, але ўсё ж выслухоўвае апошнія парады (323–418). Па дарозе Лемінкяйнен сутыкаецца з рознымі цяжкасцямі, але пераадольвае іх дзякуючы сваім ведам (419–776).*

РУНА ДВАЦЦАЦЬ СЁМАЯ ........................................ 350
*Лемінкяйнен прыязджае ў Пох'ялу на вяселле і паводзіць сябе нахабна (1–204). Ён пачынае спаборніцтва ў чароўных спевах з гаспадаром Пох'ялы і перамагае яго (205–256). Гаспадар злуецца і выклікае Лемінкяйнена на двубой (257–282). Лемінкяйнен адсякае гаспадару галаву, а гаспадыня Пох'ялы збірае цэлае войска, каб адпомсціць яму (283–420).*

РУНА ДВАЦЦАЦЬ ВОСЬМАЯ ........................................ 361
*Лемінкяйнен уцякае з Пох'ялы і пытаецца ў маці, дзе яму лепей схавацца ад помсты пах'яланцаў (1–164). Маці дакарае яго за бяздумныя ўчынкі. Яна перабірае месца за месцам і, нарэшце, раіць яму схавацца на выспе ў далёкім моры, дзе раней хаваўся ад нягод ягоны бацька (165–294).*

РУНА ДВАЦЦАЦЬ ДЗЯВЯТАЯ ........................................ 369
*Лемінкяйнен едзе ў выгнанне і даплывае да выспы, дзе пачынае весці вясёлае жыццё з усімі дзяўчатамі і жанчынамі, за што мужчыны вырашаюць забіць яго (1–290). Лемінкяйнен уцякае з выспы і трапляе ў вялікую непагадзь на моры. Човен разбіваецца, і Лемінкяйнен з цяжкасцю дабіраецца да берага, дзе атрымлівае новы човен і, нарэшце, дабіраецца да дому (291–452). Ён знаходзіць зруйнаваную сялібу, пачынае аплакваць смерць маці, але потым знаходзіць яе жывой у пушчы (453–546). Маці расказвае яму аб тым, як воіны з Пох'ялы прыйшлі і знішчылі іхнюю сялібу. Лемінкяйнен абяцае пабудаваць новае жытло і адпомсціць пах'яланцам. Ён расказвае маці пра сваё вясёлае жыццё на выспе (547–602).*

РУНА ТРЫЦЦАТАЯ ........................................ 385
*Лемінкяйнену карціць зноў падацца ваяваць у Пох'ялу, маці яго адгаворвае (1–40). Ён думае, каго б узяць з сабою, і ўрэшце вырашае паехаць са сваім старым паплечнікам Тыйрам (41–122). Гаспадыня Пох'ялы насылае на іх люты мароз, але Лемінкяйнен сваімі замовамі перамагае гэтае насланнё (123–316). Лемінкяйнен з сябрам дабіраецца па лёдзе да берага, доўга блукае па непраходных пушчах і, нарэшце, дабіраецца да родных мясцін (317–500).*

РУНА ТРЫЦЦАЦЬ ПЕРШАЯ.......... 398

*Нелады паміж братамі Унтамам і Калервам. Унтама пачынае вайну і вынішчае ўвесь род свайго брата, акрамя адной цяжарнай жанчыны, якая ў палоне нараджае сына Кулерву (1–82). Немаўлятка ўвесь час думае аб помсце, і Унтама спрабуе забіць хлопчыка, але гэта яму не ўдаецца (83–202). Кулерва падрастае і пачынае працаваць па гаспадарцы, але імкнецца шкодзіць і псуе ўсё, што толькі можна. Унтама прадае яго ў рабства Ілмарынену (203–374).*

РУНА ТРЫЦЦАЦЬ ДРУГАЯ.......... 408

*Жонка каваля Ілмарынена пасылае Кулерву пасвіць кароў. Яна не ўпадабала свайго новага раба і на полудзень яму запякае ў хлеб камень (1–32). Гаспадыня выганяе статак на пашу і прамаўляе чарадзейныя заклёны дзеля зберажэння статку ад усялякіх няшчасцяў і асабліва ад мядзведзя (33–548).*

РУНА ТРЫЦЦАЦЬ ТРЭЦЯЯ.......... 422

*Кулерва пасвіць статак. Ен збіраецца павячэраць, дастае хлеб і пачынае рэзаць. Нож ламаецца аб запечаны ў хлебе камень. Гэта вельмі засмучае яго, асабліва таму, што гэты нож быў адзіным напамінкам ад свайго роду (1–98). Раззлаваны, ён вырашае адпомсціць гаспадыні і заганяе статак у балота, а замест яго збірае воўчую зграю і мядзведзяў. Такі статак ён прыганяе дадому (99–184). Гаспадыня ідзе даіць кароў, і дзікія звяры забіваюць яе, разрываючы на шматкі (165–296).*

РУНА ТРЫЦЦАЦЬ ЧАЦВЁРТАЯ.......... 430

*Кулерва ўцякае ад Ілмарынена. Блукаючы па лесе, ён сустракае старую, якая паведамляе яму, што бацькі, брат і сястра не загінулі падчас вайны (1–128). Ён шукае сваю сям’ю і знаходзіць яе на мяжы з Лапландыяй (129–188). Маці расказвае, што лічыла Кулерву страчаным навекі. Яна расказвае хлопцу, што яго сястра пайшла ў лес і болей не вярнулася (189–246).*

РУНА ТРЫЦЦАЦЬ ПЯТАЯ.......... 437

*Кулерва бярэцца працаваць у бацькавай гаспадарцы, але карысці ад ягонай працы мала. Тады бацька пасылае яго адвезці пазямельны падатак (1–68). Па дарозе назад ён сустракае ў лесе сваю сястру, якая прапала раней, але Кулерва яе не пазнае і спакушае, завабіўшы ў санкі (69–188). Калі ж яны даведваюцца праўду, то сястра кідаецца ў рэчку і топіцца, а Кулерва едзе дадому і расказвае матцы, што згвалціў родную сястру. Ён збіраецца скончыць жыццё самагубствам (189–344). Маці забараняе яму рабіць гэта і раіць пажыць ў якім-небудзь ціхім куточку. Кулерва вырашае адпомсціць Унтаму за ўсе свае беды (345–372).*

РУНА ТРЫЦЦАЦЬ ШОСТАЯ.......... 447

*Кулерва збіраецца на вайну і высвятляе, што ўсе ставяцца да яго і ягонай задумы абыякава. Толькі маці бядуе аб сыне (1–154).*

*Ён дабіраецца да Унтамолы, забівае ўсіх і руйнуе ўсе хаты (155–250). Пасля гэтага ён вяртаецца дадому і знаходзіць сваю хату спусцелай, нікога жывога там не засталося, апрача чорнага сабакі. Кулерва з сабакам ідзе ў лес на паляванне (251–296). У лесе ён трапляе на тое месца, дзе зняславіў сваю сястру. Згрызоты сумлення апаноўваюць яго, і ён кідаецца на ўласны меч (297–360).*

РУНА ТРЫЦЦАЦЬ СЁМАЯ ........ 457

*Ілмарынен бядуе і аплаквае сваю жонку, а потым куе сабе жонку з золата і срэбра (1–162). Ён кладзе гэтую, нежывую, жонку да сябе ў ложак, але адчувае, што той бок, якім ён датыкаўся да залатой статуі, зледзянеў (163–196). Ілмарынен прапануе залатую жонку Вяйнямёйнену, але той адмаўляецца і раіць кавалю накаваць з яе якіх-небудзь карысных рэчаў або адвезці ў тыя краіны, дзе жаніхі прагнуць золата (197–250).*

РУНА ТРЫЦЦАЦЬ ВОСЬМАЯ ........ 464

*Ілмарынен едзе ў Пох'ялу, каб пасватаць малошую сястру сваёй загіблай жонкі. Там яго лаяць і бэсцяць. У шале ён выкрадае дзяўчыну і едзе дадому (1–124). Па дарозе дзяўчына таксама лае Ілмарынена і абражае яго так, што раззлаваны каваль заклёнам ператварае яе ў чайку (125–286). Ён вяртаецца дамоў і распавядае Вяйнямёйнену пра тое, як заможна і бесклапотна жывуць людзі ў Пох'яле, бо маюць цудадзейнае Сампа. Ён расказвае таксама пра свой няўдалы паход у сваты (287–328).*

РУНА ТРЫЦЦАЦЬ ДЗЯВЯТАЯ ........ 473

*Вяйнямёйнен прапануе Ілмарынену паехаць з ім у Пох'ялу па Сампа. Ілмарынен дае сваю згоду, і мужчыны выпраўляюцца ў дарогу на чоўне (1–330). Лемінкяйнен, згледзеўшы падарожнікаў, просіцца да іх. Героі з радасцю прымаюць яго ў сваю грамаду (331–426).*

РУНА САРАКАВАЯ ........ 484

*Падарожнікі рушылі па Сампа. Яны дабіраюцца да вадаспада, дзе іхны човен налятае на вялізнага шчупака (1–94). Шчупака забіваюць і з'ядаюць (95–204). Вяйнямёйнен бярэ шчупаковыя сківіцы і робіць з іх новы музычны інструмент – кантэле. Шмат хто спрабуе граць, але нічога не выходзіць. Кантэле аддаюць Вяйнямёйнену (205–342).*

РУНА СОРАК ПЕРШАЯ ........ 493

*Вяйнямёйнен сядае на камень і пачынае граць на кантэле. Усе жывыя істоты з паветра, з зямлі ды з мора збіраюцца вакол яго, каб паслухаць дзівосныя гукі кантэле (1–168). Музыка расчульвае слухачоў, на вачах у іх з'яўляюцца слёзы, нават сам Вяйнямёйнен пачынае плакаць, і слёзы ягоныя ператвараюцца ў вялікія перліны (169–266).*

РУНА СОРАК ДРУГАЯ ........ 500

*Падарожнікі дабіраюцца да Пох'ялы, і Вяйнямёйнен прапануе Лоўхі падзяліць Сампа, бо, калі тая не згадзіцца, дык яны*

*гвалтам забяруць усё (1–58). Гаспадыня Пох'ялы не згаджаецца аддаць Сампа і ўздымае супраць прыхадняў увесь народ Пох'ялы (59–64). Вяйнямёйнен пачынае граць на кантэле і сваёй чароўнай музыкай наганяе на ўсіх пах'яланцаў глыбокі сон, потым знаходзіць Сампа. Героі дастаюць яго з-пад каменнай гары і нясуць у човен (65–164). Яны спакойна адплываюць з Пох'ялы дадому (165–308). Гаспадыня Пох'ялы прачынаецца на трэці дзень і бачыць, што Сампа забралі калевальцы. Яна насылае на вандроўнікаў густы туман, моцны вецер ды іншыя навалы, каб іх неяк затрымаць. Падчас буры Вяйнямёйнен упускае сваё новае кантэле ў мора (309–562).*

РУНА СОРАК ТРЭЦЯЯ ............ 515

*Гаспадыня Пох'ялы рыхтуе карабель, узбройвае сваіх людзей і кідаецца ў пагоню за калевальцамі, каб адабраць у іх Сампа (1–22). Паміж Калевалай і Пох'ялай завязваецца бітва, і Калевала перамагае. (23–248). Аднак гэтая перамога не поўная, бо Лоўхі паспявае ўхапіць Сампа, але ўпускае яго ў мора, дзе яно разбіваецца на кавалкі (249–266). Вялікія кавалкі застаюцца на марскім дне, дзе ператвараюцца ў каштоўныя скарбы, а маленькія кавалкі хвалі выкідваюць на бераг, і Вяйнямёйнен радуецца, бо лічыць гэта прадвесцем дабрабыту (267–304). Раз'юшаная Лоўхі пагражае Калевале рознымі бедамі, аднак Вяйнямёйнен не баіцца, і гаспадыня Пох'ялы засмучаная вяртаецца дадому з непатрэбным ёй вечкам ад Сампа (305–384). Вяйнямёйнен старанна падбірае ўсе кавалачкі Сампа, садзіць іх у зямлю і жадае вечнага шчасця свайму краю (385–434).*

РУНА СОРАК ЧАЦВЁРТАЯ ............ 526

*Вяйнямёйнен бядуе, што згубіў сваё кантэле, і ідзе шукаць яго ў моры, але марна (1–76). Потым ён вырашае зрабіць з бярозы новае кантэле. Ён пачынае граць, і ўвесь свет захапляецца чароўнымі гукамі (77–334).*

РУНА СОРАК ПЯТАЯ ............ 535

*Гаспадыня Пох'ялы насылае на Калевалу розныя хваробы (1–190). Вяйнямёйнен вылечвае людзей з дапамогай моцных заклёнаў ды зёлак (191–362).*

РУНА СОРАК ШОСТАЯ ............ 544

*Лоўхі насылае мядзведзя на статкі Калевалы (1–20). Вяйнямёйнен забівае мядзведзя, і ў Калевале, як гэта патрабуе старадаўні звычай, ладзяць вялікае свята (21–606). Вяйнямёйнен іграе на кантэле, спявае і жадае вечнага шчасця Калевале (607–644).*

РУНА СОРАК СЁМАЯ ............ 560

*Вяйнямёйнен грае, і месяц, а потым сонца спускаюцца з неба, каб паслухаць цудоўную музыку, але гаспадыня Пох'ялы, старая Лоўхі, зачыняе іх у пячоры і выкрадае з Калевалы ўвесь агонь (1–41). Галоўны бог Ука кепска пачувае сябе без цяпла ды святла,*

*а таму выкрасае агонь новаму месяцу і сонцу (42–82). Агонь падае на зямлю, і Вяйнямёйнен з Ілмарыненам выпраўляюцца на яго пошукі (83–126). Ілматар, дзева паветра, расказвае ім, куды падзеўся агонь: яго праглынула рыбіна ў возеры (127–312). Героі спрабуюць злавіць рыбіну нератам, але марна (313–364).*

РУНА СОРАК ВОСЬМАЯ ........................................ 569

*Калевальцы сеюць лён, прадуць ніткі і вяжуць нерат, потым ловяць шчупака, які праглынуў агонь (1–192). Яны дастаюць агонь з рыбіны, але ўпускаюць яго, пры гэтым Ілмарынен атрымлівае моцныя апёкі (193–248). Агонь лютуе ў лесе, спустошае навакольныя землі. Яго нарэшце ловяць і прыносяць у цёмныя халодныя паселішчы Калевалы (249–290). Ілмарынен лекуе свае апёкі, і яны загойваюцца (291–372).*

РУНА СОРАК ДЗЯВЯТАЯ ........................................ 579

*Ілмарынен робіць новы месяц і новае сонца, але яны не свецяць і не грэюць (1–74). Вяйнямёйнен варажбою ды гаданнем даведваецца, што сонца і месяц зняволеныя ўнутры горнай пячоры ў Пох'яле. Ён ідзе туды, змагаецца з людам Пох'ялы і перамагае (75–230). Але дабрацца да сонца і месяца ён не можа (231–278). Вяйнямёйнен вяртаецца дамоў, каб зрабіць зброю, з дапамогай якой ён можа вызваліць сонца і месяц. Калі Ілмарынен пачынае каваць яе, гаспадыня Пох'ялы, спалохаўшыся, выпускае сонца і месяц на волю (279–362). Сонца і месяц зноў плывуць па небе. Вяйнямёйнен вітае іх і жадае, каб яны свяцілі вечна і прыносілі шчасце людзям (363–422).*

РУНА ПЯЦІДЗЯСЯТАЯ ........................................ 590

*Мар'ята, калевальская дзяўчына, з'ела бруснічыну, зацяжарыла і нарадзіла сына (1–350). Хлопчык нечакана знікае, але праз пэўны час яго знаходзяць у балоце (351–424). Каб ахрысціць дзіцёнка, запрашаюць старога, але той адмаўляецца хрысціць дзіцёнка, чый бацька невядомы, таму трэба яшчэ высветліць: магчыма, гэтага хлопчыка нельга пакідаць сярод жывых (425–440). Тут прыходзіць Вяйнямёйнен і кажа, што дзіўны хлопчык павінен памерці, але малы дакарае Вяйнямёйнена за такі жорсткі і несправядлівы прысуд (441–474). Дзед нарэшце хрысціць дзіця і прадракае, што той будзе каралём Карэліі. Вяйнямёйнен злуе і крыўдуе. Ён ідзе прэч, кажучы, што яшчэ спатрэбіцца свайму народу, каб стварыць новае Сампа і кантэле. Ён адплывае на меднай лодцы за небакрай, пакідаючы свае цудоўныя песні і кантэле народу (475–512). Заключны спеў (513–620).*

Некаторыя імёны ды назвы, якія сустракаюцца ў тэксце эпасу ........................................ 606

*Якуб Лапатка*. Мая Калевала ........................................ 609

# Руна першая

*Уступ (1–102). Дзева паветра апускаецца на марскія хвалі і, зацяжараўшы ад ветру і вады, становіцца маці вады (103–176). Качка звівае гняздо на калене маці вады і адкладае яйкі (177–212). Яйкі выпадаюць з гнязда і разбіваюцца на кавалкі, што ператвараюцца ў неба, зямлю, сонца, месяц ды хмары (213–244). Маці вады стварае мысы, затокі, берагі, водмелі ды глыбіні мора (245–280). Маці вады нараджае Вяйнямёйнена; яго доўгі час носіць па хвалях, аж пакуль прыбоем не прыганяе да берага (281–344).*

У мяне узнікла думка,
нарадзілася жаданне
заспяваць, завесці песні
ды пусціць за словам слова
старажытных песняспеваў,
роду нашага паданняў.
Растаюць у роце словы,
з вуснаў порстка рвуцца птушкай,
з языка яны злятаюць
ды паміж зубоў сплываюць.
Мілы сябра, братка любы,
залатых гадоў таварыш!
Заспявайма разам песню
ды прамовім разам словы,
раз сышліся з двух бакоў мы,
тут сышліся на сустрэчу!
Рэдка мы бываем разам,
рэдка бачымся з табою
на прасторах запусцелых,
дзе паўночны край убогі.
То свае давай мне рукі,
моцна счэпім нашы пальцы,
агалосім свае песні
ды найлепшыя паданні,
каб сябры іх нашы ўчулі
і паслухалі прыветна,
каб пачулі нашы дзеці,
каб пачула наша моладзь –

як збіралі, зберагалі
тыя вершы, тыя спевы
ў апаяску Вяйнямёйнен,
Ільмарынен дужы ў кузні,
з мечам той Каўкаміелі,
з лукам ладным Ёўкахайнен
у паўночным тым памежжы
Калевалы верасовай.
Іх спяваў калісьці бацька,
як вырэзваў тапарышча;
маці навучала песням,
пеючы пры калаўроце,
я ж тады малым дзіцёнкам
у яе ў нагах круціўся,
недарослы, неразумны,
з малаком на падбароддзі.
Словаў шмат было пра Сампа
ды пра чары хітрай Лоўхі:
і старэла ў песнях Сампа,
згінула праз чары Лоўхі,
Віпунен сканаў праз спевы,
Лемінкяйнен – праз забавы.
Ёсць яшчэ нямала песень,
я й замоў нямала помню,
што я назбіраў па ўзмежках
ды з галінак верасовых,
ды з кустоў каля дарогі,
з розных парасткаў маленькіх,
з патаптаных спелых траваў,
там, дзе пасвіў я гавяду
у гады свайго маленства,
пастушком хадзіў за статкам,
там, па купінах мядовых,
там, па залатым раздоллі
ўслед за Муўрыкі чарнявай,
побач з Кімаю пярэстай.
Наспяваў мароз мне песні,
дождж нашапацеў мне вершаў.
Вецер слоў яшчэ навеяў,
хвалі з мора нашапталі.
Птушкі ў шэраг словы склалі,
вершаліны дрэў – у сказы.
Я зматаў іх у клубочак,

у адзін маток звязаў іх.
Я паклаў клубок на сані,
у вазок паклаў я звязку,
песні я прывёз дадому,
да асеці іх давёз я
і паклаў у медны кошык
на паліцу на гарышчы.
Доўга песні на марозе
у маркоце праляжалі.
Ці не ўзяць іх нам са сцюжы,
не забраць з марозу песні?
не занесці ў хату кошык
ды на лаву тут, пад столлю,
пад магутнай кроквай новай
ды прыгожаю паставіць?
Мо адчынім кошык песень,
поўную паданняў скрынку,
каб клубок той разматаць нам,
развязаць маток легендаў?
Лепшую спяю вам песню,
каб як найладней гучала,
хай дадуць мне хлеба лусту,
паднясуць мне куфаль піва.
А калі не будзе піва
альбо квасу маладога –
то спяю я песню нашча,
нават без вады, насуха,
каб вясёлым быў наш вечар,
каб уславіць дзень мінулы
ды парадаваць дзень новы,
ранне новае пацешыць.
Чуў я некалі, як песні
дзіўнаспеўныя складалі:
па адной прыходзяць ночы,
паасобку дні нам ззяюць,
і ў самоце нарадзіўся
Вяйнямёйнен – песняспеўца,
юнай Ілматар дзіцятка,
маладой дачкі паветра.
На паветраных прасцягах
гожае дзіця прыроды
доўга берагло цнатлівасць,
заставалася нявінным

# Руна другая

*Вяйнямёйнен выходзіць на сушу, дзе няма ніводнага дрэўца і пасылае малога Сампсу Пелервойнена засеяць зямлю дрэвамі (1–42). Дрэвы вырастаюць, не прарастае толькі дуб, але, зноўку пасеяны, ён разрастаецца так, што сваімі шатамі захінае сонца і месяц (43–110). Маленькі чалавек выходзіць з мора і ссякае дуб; сонца і месяц ізноў бачныя (111–224). На дрэвах пяюць птушкі, на зямлі вырастаюць травы, кветкі ды ягады, не расце толькі ячмень (225–236). Вяйнямёйнен знаходзіць на беразе некалькі зярнят ячменю, высякае лес і пакідае толькі адну бярэзіну для птушак (237–264). У падзяку за гэта арол высякае для Вяйнямёйнена агонь, каб той мог выпаліць ляда (265–286). Вяйнямёйнен засявае ячмень і ўзносіць модлы, каб ячмень даў добрыя парасткі, а зямля заўсёды была ўрадлівая (287–378).*

Вось падняўся Вяйнямёйнен,
стаў нагамі на ўзбярэжжа
выспы між бурлівых хваляў –
выспы змрочнай і бязлеснай.
Шмат гадоў так праляцела,
і герой жыў год за годам
там, на выспе сярод мора,
выспе змрочнай і бязлеснай.
Думае герой, мяркуе
доўга галаву ламае:
хто ж яму засее землі,
хто насенне ў глебу кіне?
Пелервойнен, сын паляны,
Сампса, хлопчык-недаростак –
ён яму засее землі
ды насенне ў глебу кіне!
Засявае ён рупліва
і пагоркі, і балоты,
і адкрытыя паляны,
камяністыя лагчыны.
Па гарах ён сосны сеяў,
елкі сеяў на пагорках,
верасы – на сухадолах,

зараснікі – па нізінах,
а бярэзіны – ў далінах.
Сеяў вольхі ў мяккай глебе,
а чаромхі – у вільготнай,
у нізінных месцах – вербы,
ў месцах святасці – рабіны,
а ракіты – ў глебе пульхнай,
а ядлоўцы – у цвёрдай глебе,
а дубровы – каля рэчак.
Дрэвы пачалі ўздымацца,
парасткі пагналі ўгору.
Запярэсціліся елкі,
весела ўзбуялі сосны
і бярэзіны ў даліне,
вольхі ў глебе між разораў,
і чаромха заквітнела,
і ядловец з глебы ўзняўся.
Плод чароўны – у ядлоўца,
а ў чаромхі – квет цудоўны.
Векамудры Вяйнямёйнен
вырашыў зямлю агледзець,
паглядзець пасевы Сампсы,
Пелервойнена работу.
Бачыць: дрэвы падняліся,
парасткі ўсе расквітнелі,
толькі дуб яшчэ не вырас,
не ўзышло святое дрэва.
Неслуха ён так пакінуў:
хай расце сабе на шчасце;
пачакаў яшчэ тры ночы
і тры дні яшчэ марудзіў;
потым зноў пайшоў пабачыць,
тыдзень цэлы прачакаўшы –
толькі дуб яшчэ не вырас,
не ўзышло святое дрэва.
Чатырох дзяўчат убачыў,
выйшлі пяць нявест на бераг.
На лугу траву касілі,
травы росныя зразалі
на заўжды туманным мысе,
на лясістай дальняй выспе;
Што накосяць – пазграбаюць,
пазбіраюць на прасушку.

Тут на бераг выйшаў Турсас,
муж з марскіх узняўся хваляў;
сена ў полымя ён кінуў,
у агонь той ненажэрны,
і пусціў на попел сена
ды на дым – траву сухую.
Засталася толькі кучка
попелу з сухога сена.
Ён лісток паклаў у попел
разам з жолудам дубовым –
і з яго дубочак вырас,
парастак зялёны ўзняўся,
ягадай прыгожай вырас,
узбуяў ды раздваіўся.
Шырака галлё раскінуў,
густа распусціў лістоту,
верхавіну ўзнёс да неба;
свет сукамі затуліўшы,
хмарам не дае праходу,
плыць аблокам замінае,
захінае ў небе сонца,
затуляе месяц ясны.
Тут вось мудры Вяйнямёйнен
меркаваць пачаў і думаць:
хто ж паваліць дуб магутны,
хто ссячэ такое дрэва?
Цяжка й сумна чалавеку,
рыбам у вадзе журботна,
як удзень не свеціць сонца,
месяц ноч не асвятляе.
Ды няма на свеце мужа,
на зямлі няма асілка,
хто зваліў бы дуб магутны,
паваліў бы сто вяршыняў.
Векамудры Вяйнямёйнен
словы гэткія прамовіў:
«Каві, родная матуля,
слаўная дачка прыроды!
Ты прышлі з вады мне сілу –
бо ў вадзе людзей нямала –
хто зваліў бы дуб магутны,
паваліў бы злое дрэва,
што нам засціць сонца ў небе,